Маральныя нормы ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны ў традыцыйнай культуры беларусаў

Іваненка Мікалай Міхайлавіч,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце

Ад першых людзей на Зямлі і да нашага часу тэма ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны чырвонай стужкай праходзіць праз усё жыццё. Гэтая тэма вельмі вялікая і шматбаковая. Мы можам разглядаць яе ў многіх плоскасцях: узаемаадносіны ў жыццёвых абставінах зусім чужых знаёмых і малазнаёмых людзей, або блізкіх сяброў (сусед і суседка, калегі па працы, начальнік і падначаленая, начальніца і падначалены, спадарожнікі і г.д.); людзей, звязаных родавымі сувязямі (муж і жонка, бацька і дачка, маці і сын, брат і сястра, бабуля і ўнук, свацця і сват і г.д.); людзей, звязаных нейкімі сацыяльнымі ці рэлігійнымі сувязямі (кум і кума, святар і прыхаджанка, жонка святара і прыхаджанін, бабуля–павітуха і бацька дзіцяці, або ўнук і г.д.). Але напэўна самую вялікую цікаўнасць уяўляюць узаемаадносіны мужчыны і жанчыны як прадаўжальнікаў чалавечага роду. Традыцыйная культура беларусаў дае нам багаты матэрыял – мноства занатаваных фальклорных твораў сямейна–бытавой абраднасці, святаў, звычаяў і традыцый, народнай педагогікі, дзе мы знаходзім сапраўдныя ўзоры маральна–этычных нормаў узаемаадносін мужчыны і жанчыны, якія паспяхова можна выкарыстоўваць у практыцы выхаваўчай работы сучаснай школы.

Адна з галоўных задач выхавання, якая сёння стаіць перад грамадствам, – падрыхтоўка дзяцей, падлеткаў і моладзі да сямейнага жыцця, выхаванне будучых мужа і жонкі, годных да нараджэння і выхавання фізічна і духоўна здаровых дзяцей – дастойных грамадзян сваёй краіны.

“Моцная сям’я – моцная дзяржава”. Гэта не проста выказванне, гэта бясспрэчная ісціна. Моц сям’і, яе энергетыка, узнаўленчы і выхаваўчы

патэнцыял цалкам залежыць ад узаемаадносін мужчыны і жанчыны – мужа і жонкі, ад іх кахання і ўзаемапаразумення. А сіла кахання, шчырасць і згода залежаць ад духоўнага стану, выхаванасці і ўнутранай культуры кожнага. З гадамі на дапамогу прыходзіць жыццёвая мудрасць, але калі ёй не папярэднічалі належнае выхаванне, то нават самая вялікая мудрасць можа не паправіць становішча.

Чаму сёння так востра ставіцца пытанне падрыхтоўкі дзяцей і моладзі да сямейнага жыцця? Таму, што мы бачым як хутка ідзе працэс разбурэння сям'і. Высокія хрысціянскія ідэалы мужнасці і высакароднасці мужчыны, цярпення, дабрыні і спагады жанчыны, стрыманасці і цнатлівасці абоіх, падмяняюцца ідэаламі гламурных попзорак, якія падаюць прыклады разбэшчанасці і вольнасці ў паводзінах. Іх вобразы настолькі моцна ўздзейнічаюць на сучасную моладзь і падлеткаў, што мы назіраем зараз працэсы разбурэння міжпалавых адрозненняў, не толькі ў адзенні, прычосках і ўпрыгожаннях, але і ў тых жа паводзінах. Многія тэлеперадачы, сайты інтэрнэта, газеты і часопісы, паразітуючы на нізкіх пачуццях чалавека, груба і цынічна разглядаюць адносіны паміж мужчынам і жанчынай толькі як сексуальных партнёраў, больш таго, настойліва прапагандуюць аднаполае "каханне".

Ці знойдуць, як вырастуць, сваё шчасце ў сямейных адносінах і стануць добрымі бацькамі тыя хлопчыкі і дзяўчынкі, якія зараз з малалецтва не толькі курацьі ўжываюць спіртныя напоі, але і стараюцца ўсё перапробаваць у жыцці? Цяжка сказаць. Але адно дакладна вядома – з разарванага да часу бутона ніколі не выйдзе прыгожай кветкі. Чым большая палавая дасведчанасць, тым менш шанцаў зведаць сапраўднае каханне. Падзенне вялікіх народаў і іх выміранне пачыналася з падзення маральных нормаў.

Чаму такі вялікі працэнт разводаў? Чаму так многа сем'яў, дзе муж і жонка жывуць без згоды? Чаму столькі дзяцей–сірот пры жывых бацьках? Чаму столькі старых людзей карыстаюцца доглядам дзяржаўных устаноў, а

не сваіх дзяцей? А ўсё гэта таму, што ідзе страшэнная знявага любові ва ўсіх яе праявах. Горда і дзёрзка скінуты покрыў з граху і, больш таго, грэх, недастойны годнасці чалавека, пачалі называць “каханнем”. Замест высакародных, цнатлівых мужчыны і жанчыны прапагандуецца ідэал часовага “партнёра”, замест асвечанага Богам шлюбу – “гражданский брак”, дзе ніхто ні перад кім і нічым не абавязаны. Вакол разбэшчаных людзей штучна ствараецца арэол “сучаснасці” і “прадзвінутасці”. Псіхічныя зрухі ў паводзінах прапагандуюцца як норма, дастойная пераймання.

Сапраўднае каханне можа ўзрасці толькі ў чыстым сэрцы. Яно там, дзе адказнасць за ўсё, што робіш, гаворыш і нават думаеш, дзе ўзаемная самаахвярнасць, дзе цярпенне, дзе свабода, але не свабода паводзін, а свабода ад граху. Толькі таму, хто зберажэ сябе ў чысціні, усе страты і цяжкасці жыцця, усе затрачаныя сілы і ахвяраванні акупяцца ў сямейным жыцці ў тысячы разоў – павагай людзей, шчасцем высокага кахання і прыгожых узаемаадносін, радасцю бачыць такіх жа шчаслівых, годных дзяцей і ўнукаў, адчуваннем выкананага абавязку на зямлі і “мірнага, непастыднага” адыходу ў вечнасць. Менавіта ў гэтым бачылі сэнс чалавечага жыцця нашы бацькі, дзяды і прадзеды.

Нават традыцыйнае адзенне беларусаў можа сведчыць аб маральных нормах людзей, якія яго насілі, бо знешні выгляд – люстэрка ўнутранага стану чалавека (як бы добра было, каб і сёння людзі памяталі пра гэта!). Адзенне было не толькі зручным у выкарыстанні, яно павінна было як мага больш закрываць усе часткі цела. Асобныя дэталі касцюма, асабліва жаночага, былі прадуманы так, што ні пры якіх абставінах не магла агаліцца ні нага, ні рука, не кажучы пра больш інтымныя месцы. Жанчына ў такім касцюме здавалася недасягальнай, яна была загадкай і ўжо знешнім выглядам выклікала павагу. Гэта быў вобраз, чысты і ўзнёслы, амаль святы, пра які нават у думках нельга было б дапусціць штосьці дрэннае.

Маральныя прынцыпы беларусаў, іх высокія патрабаванні да чысціні ў адносінах паміж хлопцам і дзяўчынай да шлюбу больш за ўсё засведчаны ў

вясельных абрадах. Так падчас пасаду – абрад бласлаўлення жаніха і нявесты на шлюб – маладых садзілі на хлебную дзяжу, якая сімвалізавала багацце і шчасце. Той, хто не збярог цнатлівасці, не мог садзіцца на дзяжу, бо баяўся наклікаць бяду на будучую сям'ю. Вельмі рэдкімі былі такія выпадкі, калі нехта з маладых адмаўляўся ад пасаду. Гэта станавілася прычынай страшэнных перажыванняў не толькі тых, хто не збярог цнатлівасці, але і іх бацькоў і родных. Адзін з такіх выпадкаў апісваецца М.В. Доўнар–Запольскім: "...жаніх падняўся, перахрысціўся і зноў прыпаў да зямлі. Мёртвае маўчанне працягвалася. Я перавёў позірк з жаніха на яго бацьку. Твар яго быў белы, ён увесь тросся, як у ліхаманцы, але не рухаўся з месца, скіраваўшы гнеўны позірк на сына, які ўжо трэці раз апускаўся на зямлю. Маці жаніха глядзела на сына вачамі , поўнымі жалю. Не ўстаючы з зямлі і нікуды не гледзячы, жаніх павярнуўся ў бок бацькі і прыпаў да яго ног, абліваючыся слязамі і ўздрыгваючы ад глухіх рыданняў. Бацька нагамі пачаў біць сына, але той не ўставаў... Многія пачалі прасіць бацьку дараваць сыну і блаславіць яго. "Не, – сказаў той,– хоць я бласлаўлю, але Бог яго не блаславіць, калі ён гэтак зрабіў; гэтакае тваё будзе жыццё..." З вялікай цяжкасцю ўпрасілі бацьку блаславіць сына..." [5.21-22]. Усё гэта адбывалася на вачах многіх родзічаў і аднавяскоўцаў. Сорам перад людзьмі, а найбольш страх Божага гневу надзейна стрымлівалі людзей ад спакусаў жыцця.

У традыцыйнай культуры беларусаў мы можам знайсці асновы моцнай сям'і, умоў сямейнага выхавання і ўзаемаадносін мужа і жонкі, Бацькі і Маці. Увесь народны этыкет прасякнуты павагай да іншага, нават зусім чужога, чалавека, а пра пяшчотныя адносіны ў сям'і нам сведчаць безліч тэкстаў сямейна–абрадавай паэзіі: "...Жонка – пакраса мая, дзеткі – пацеха мая..."[9.213].

"Нявесту шукае чалавек, а жонку дае Бог", – так заўсёды гаварылі ў народзе з верай, што шлюбы адбываюцца на нябёсах. Вялікае каханне – гэта дар Божы за вялікае цярпенне і за вялікую працу над сабой. Нашы продкі

добра ведалі гэта. Можа, таму і плакалі, спяваючы абрадавыя вясельныя песні.

Нягледзячы на сапраўды высокі ўзровень чысціні і цнатлівасці, дзяцей беларусы не знаходзілі ў капусце, яны з'яўляліся на свет самым натуральным шляхам. Узаемаадносіны мужа і жонкі ў шлюбе наша традыцыйная культура ніколі не разглядала як нешта брыдкае, чаго трэба саромецца. Гэтая тэма мала абмяркоўваецца публічна і ў сям'і не таму, што яна прыніжаная, а наадварот – таму, што занадта ўзвышаная. Яна з вымярэння, якое вышэй чалавечага разумення, яна з вобласці Божага промыслу. Царква таксама ставіцца да шлюбу як да вялікай таямніцы, што вышэй узроўню плоці. Інтымныя адносіны паміж мужам і жонкай – свяшчэннадзейства працягу жыцця і абарона ад разбуральнай блуднай пошасці.

Свяшчэннае Пісанне дае строгія маральныя правілы паводзін і ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны ў шлюбе і па за ім. Так апостал Павел у сваіх пасланнях гаворыць: "Пакіне чалавек бацьку свайго і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое адным целам." [Еф.5:31]. "Жонка не ўладарыць над сваім целам, а муж; аднолькава і муж не ўладарыць над сваім целам, а жонка." [Кор.7:4]. "Жонкі, падпарадкоўвайцеся сваім мужам, як Госпаду. Мужы, любіце сваіх жонак, як і Хрыстос палюбіў Царкву і аддаў сябе за яе, каб асвяціць яе..." [Еф.5:22-26]. Евангелле ад Лукі гаворыць нам: "Усякі, хто разводзіцца з жонкаю сваёю і жэніцца з другой – пралюбадзейнічае; і ўсякі, хто жэніцца на разведзенай з мужам, пралюбадзейнічае." [Лк.16:18]. Па хрысціянскіх канонах пралюбадзеянне – адзін з сямі "смяротных" грахоў, а значыць хрысціянін павінен утрымліваць сябе не толькі ад фізіялагічнага акту, а нават ад грахоўнай думкі. І Евангелле канкрэтна сцвярджае нам словамі самога Хрыста: "Вы чулі, што сказана продкам: "Не пралюбадзейнічай". А я кажу вам, што ўсякі, хто глядзіць на жанчыну з пахаценнем, ужо пралюбадзейнічаў з ёю ў сэрцы сваім." [Мц.5:27-28].

Народная мудрасць дакладна дэманструе нам не толькі добрае разуменне беларусамі хрысціянскіх прынцыпаў жыцця, але і згоду з імі. Так

у прыказках і прымаўках сцвярджаецца: “Не паглядай на чужых жонак: ці скасееш, ці здурнееш” [2.137]. “Не дай, доля, два разы жаніцца...” [2.137]. “Калі любіш – ажаніся, а не любіш – адкасніся” [2.134]. Апошняя прымаўка якраз і гаворыць нам аб недапушчальнасці пазашлюбных адносін. Нават у шлюбе муж і жонка вялі сябе стрымана, асабліва на людзях. “Каханне – гэта адносіны паміж двума, і афішыраваць іх лічылася ў народзе непрыстойным. Муж не цалаваў і не абдымаў жонку пры людзях” [4.28]. А наколькі сур’ёзна ўспрымаўся шлюб, адназначна сведчаць нам многія вясельныя песні, што вучылі раней маладых: пасля вяселля зваротнай дарогі няма!

Пайду я замуж ды даведаюся –
Калі добра будзе, дык я нажывуся,
А калі пагана, дык назад вярнуся.
Я ў свайго татачкі служыць наймуся:
Прымі мяне, татачка, да хаця і з хлебам.
– Ты ж міне, дзіцятка, цяпер не трэба [5.449].

Не родным дзіцям у хату бацькі, а толькі наймічкай збіралася вярнуцца дачка пасля няўдалага шлюбу і нават у гэтым прыніжаным статусе бацька не прымае яе.

Шлюб, дзе трэба нараджаць і выхоўваць дзяцей, жыць у пастаянным клопаце аб бліжніх, або манастыр, дзе таксама самаахвярнае служэнне Богу, паўсядзённая праца і стрыманасць ва ўсім. Іншага шляху не было. Калі нехта не жаніўся ці не ішоў замуж і пры гэтым не жадаў ісці ў манастыр (а такія прыклады былі ў нашай гісторыі), то заставаўся пры жанатых братах ці замужніх сёстрах і, дапамагаючы ім расціць дзяцей, таксама жыў у працы і чысціні.

Вялікае мноства малітваў, якімі карысталіся беларусы (і не толькі складзеныя святарамі ці манахамі, а і простыя, народныя), сведчаць нам праз вякі аб шчырасці веры, душэўнай чысціні і жаданні нашых дзядоў жыць у праўдзе і ісціне: “Стоячы перад Табою, Госпадзі, я прыношу ўсе свае справы жыцця майго, і Ты благаславі маю сям’ю, маю шчырую працу, мае добрыя

намеры і вядзі мяне па жыцці, каб не пахіснуліся ногі мае…” [3]. Гэта вытрымка з малітвы за бацькоў і родных, у якой маецца на ўвазе не фізічная моц ног, а сіла духоўная, якая б дапамагла ўтрымацца на сцежцы да Бога. “Усяшчодры Ойча, Ты ў Сваёй дабрыні памятаеш пра ўсе стварэнні; Ты дбаеш і пра гняздо кожнае птушкі з птушанятамі, і нішто ў свеце не дзеецца без Твайго ведама…” [3]. А гэтыя словы з малітвы на ўваход у Царкву, дзе вобразы птушкі з птушанятамі асацыіруюцца з сям’ёй і з дзецьмі.

Калі ж гаварыць пра каханне як пра пачуццё годнае чалавека, які жыве ў суладдзі з Богам, то і тут апостальскае пасланне дае нам канкрэтную фармуліроўку: “Любоў доўгацярплівая, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не ўзвышаецца, не ганарыцца, любоў не бясчынствуе, не шукае свайго, не раздражняецца, не думае злога, не радуецца няпраўдзе, а радуецца ісціне; Усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё зносіць” [Кар. 13:4-7]. Вось якой павінна быць любоў у хрысціянскім светапоглядзе, носьбітамі якога многія вякі былі нашы продкі і трэба было б, каб з’яўляліся мы.

У каханні чалавек падымаецца на новую, больш высокую ступень духоўнасці, дзе не можа быць грубай паказной эротыкі, бо там пераплятаецца цэлая гама высокіх паэтычных пачуццяў: сапраўднага рыцарства і пяшчоты, адданасці і вернасці, прыстойнасці і гонару быць маці і бацькам. Праз гэты Богам створаны саюз, дзе двое становяцца адным цэлым, нараджаецца новае жыццё. “Тайна гэтая вялікая” [Еф.5:32], – зноў жа нагадвае нам Свяшчэннае Пісанне.

Раней у багатых шляхетных сем’ях дзецям забаранялася без дазволу заходзіць у спальню бацькоў нават днём, калі там нікога не было. У спальні нельга было проста гуляць ці шумець. Гэта незвычайны пакой, да яго ставіліся, як да святога месца, дзе адбываецца амаль не падуладная зямному розуму тайна дваіх, сведкам якой быў толькі Бог. Без тэлекамер, рэжысёраў і гледачоў.

На жаль, сёння людзі разам з чысцінёй сэрца страчваюць і разуменне велічы і прыгажосці ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны як прадаўжальнікаў чалавечага роду.

У Маскоўскім выдавецтве “Ладамір” у 2006 годзе выйшла ў свет кніга “Беларускі эратычны фальклор”, якая даволі смела дэманструе нам зусім іншыя каштоўнасці. Не ўсё так проста, як здаецца ўкладальніцы гэтага абсалютна непатрэбнага выдання Таццяне Валодзінай. Далёка не ўсе творы яе кнігі можна назваць эратычнымі, а сапраўды эратычныя – не ўсе можна аднесці да традыцыйнай культуры беларусаў. Трэба нагадаць, што “эратычны” – значыць “празмерна пачуццёвы” [1.400] менавіта, празмерна. Старадаўнія фальклорныя тэксты такой празмернасці не дапускаюць, нават самыя адкрытыя з іх – вясельнай і радзіннай абраднасці: “Дайце маладым сыра, што б да году радзілі сына...” [5.241]. “Дарую бульбы падполле і дзяцей застолле” [5.24]. Якая ў гэтых пажаданнях эротыка? Другая справа – фальклор савецкага часу, там сапраўды эротыка, але занадта брудная. Асабліва дасталася куму з кумою. Фрывольны фальклор прадстаўляе іх як эратычна заклапочаных асоб, якім “адно” толькі трэба. Тым не менш мы павінны памятаць, што ў традыцыі беларусаў кума і кум заўсёды мелі падкрэслена паважлівыя адносіны. Калі за кумоў бралі хлопца і дзяўчыну, то абавязкова пыталіся ці няма паміж імі закаханасці, каб не перабіць кумаўствам магчымага шлюбу, бо пасля хрысцін кум і кума не маглі жаніцца і ўсё жыццё яны звярталіся адзін да аднаго на “вы”.

Канешне, прадстаўленыя ў кнізе Таццяны Валодзінай творы – гэта таксама нейкая частка культуры, але культуры нізоў, не абцяжараных правіламі прыстойнасці. “Знявечаны дух нараджае знявечаныя формы” [7]. Плады сведчаць аб дрэве, а плады творчасці – аб іх творцы. У народзе такімі “шэдэўрамі” карысталіся не так часта, і не надта паважаныя людзі.

На кнігу, выдадзеную ў Маскве, можна было б не звяртаць увагі, бо кніга, па словах аўтара, – навуковае выданне, і сама Таццяна Валодзіна не ставіла мэты распаўсюджання і прапаганды эратычнага фальклору. Тым не

менш, прапаганда ідзе, а разам з ёй ідзе і знявага адвечных высакародных характарыстык нацыі. Так, Анастасія Зелянкова ў артыкуле “Голая праўда пра беларусаў” піша: “Міф пра залішнюю цнатлівасць беларусаў адразу ж знікае, калі пачынаеш больш пільна прыглядацца да зместу самых, здавалася б, бяскрыўдных узораў вуснай паэтычнай творчасці. Галоўнае – умець расчытаць іх сэнс. Згадзіцеся, не кожны зможа ўбачыць у вядомай песні “Ясю коніка паіў, Кася ваду чэрпала” апісанне палавых стасункаў?...” [10].

Канешне, выхаванае на тэлеперадачах Ксеніі Сабчак і Сяргея Зверава пакаленне “расчытае” свой сэнс у любым тэксце. А вось што пра тую ж самую песню гаворыць нам чалавек з іншым выхаваннем. Ніл Гілевіч – заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы піша: “Змест беларускіх песень пра каханне вызначаецца высакароднасцю і чысцінёй пачуццяў, для яго зусім не ўласцівыя элементы эротыкі і натуралізму. Пра пачуццё кахання ў любоўнай народнай лірыцы гаворыцца непасрэдна і адкрыта, толькі ў рэдкіх выпадках прыбягаючы да іншасказання або намёкаў, і то зусім празрыстых, як, напрыклад, у вядомай песні пра рэчаньку, з якой “Янка коніка паіў, Маня ваду чэрпала”…” [6.6-7]. Намёк на чыстае каханне паміж хлопцам і дзяўчынай бачыць у гэтай песні Ніл Гілевіч, а не тое, пра што піша спадарыня Зелянкова… Вось ужо сапраўды “ад купіны да Казбека – у залежнасці ад чалавека”!

Яркую калекцыю фрывольнага фальклору не толькі сабраў, але і выдаў прыгожай кніжкай Рыгор Барадулін. Шкада, што такі паважаны чалавек звярнуў увагу і прылажыў столькі намаганняў для зберажэння менавіта гэтага набытку “культуры” роднай Ушаччыны.

Тую ж праблему эратычнасці беларускага фальклору падымае ў сваім даследаванні “Секс і эротыка ў беларускай традыцыйнай культуры” дацэнт кафедры гісторыі і сацыялогіі ПДУ Уладзімір Лобач, скардзячыся на дыскрымінацыю “вясковага інтыму” з боку хрысціянскай царквы і абвінавачваючы этнографаў 19–20 стагоддзяў, што тыя «апускалі» абрад «пакладання маладых», ці «каморы», у апісанні традыцыйнага вяселля [8].

Паганскія эратычныя абрады можна адносіць да культуры беларусаў прыкладна так, як людаедства да культуры некаторых плямёнаў, якія даўно жывуць цывілізаваным жыццём. Але ж дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што і ў язычніцкія часы цнатлівасць таксама была ў пашане, а пахатлівая дзеўка ці хлопец неслі знявагу бацькам і ўсяму свайму роду.

Як нельга рускую мову характарызаваць на аснове турэмнага жаргону, так жа нельга па падплотнай паэзіі, у большасці сваёй савецкага часу, або па абрадах паганскага часу, рабіць высновы аб празмернай эратычнасці беларускага фальклору і разбэшчанасці ўсёй нацыі. Няхай сабе і робіцца гэта як камплімент.

На сучасных дзяцей, падлеткаў і моладзь ідзе даволі моцнае разбуральнае ўздзеянне не толькі з боку СМІ і камп'ютэра, а яшчэ і з боку масавай попкультуры. Адны толькі назвы музычных гуртоў гавораць самі за сябе: "Звери", "Вирус лиха", "Без билета" і іншыя. Многія іх песні без жаху не паслухаеш. І на такой "лірыцы кахання" ўзрастаюць зараз многія дзеці. Ці трэба ў гэтай сітуацыі выцягваць на паверхню нейкую негатыўшчыну яшчэ і з фальклору, калі нават яна там і ёсць. Падобны матэрыял, якой бы навуковай важнасцю ён ні прыкрываўся, утрымлівае ў сабе небяспечную для чалавека энергію разбурэння духу.

Шмат у фальклоры разумных і добрых твораў, менавіта іх і трэба ўключаць у выхаваўчую практыку. Багатая і разнастайная народная лірыка кахання простай, цудоўнай мовай перадае нам пачуцці невымернай глыбіні. Закаханыя хлопец і дзяўчына ў свядомасці народа вызначаюцца не толькі чалавечай прывабнасцю, але і высакароднасцю духу. Прыгожы і паэтычны вобраз, чулы і спагадлівы, шчыры і даверлівы, для якога цнатлівасць і вернасць – аснова жыцця, можа быць сапраўдным прыкладам для выхавання сучаснай моладзі.

У Вілейскай гімназіі №2 мы стараемся выкарыстоўваць такі фальклор, які б не падштурхоўваў вучня–падлетка ці амаль дарослага старшакласніка да грахоўных думак і памкненняў, а выводзіў бы яго на ўзровень правільнага

разумення ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны, жадання дасягнуць і перажыць самому ўзнёслыя і чыстыя пачуцці, якія ўзбагачаюць душу, даюць ёй стваральную энергію і жыццёвую моц.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Баханькоў, А.Я., і інш. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А.Я. Баханькоў – 5-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Нар. асвета, 1996.
2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі; Прадм. Д. Бугаёва.– Мінск: Бел. навука, 2004.
3. Беларускі праваслаўны малітоўнік. – Беласток, 1996.
4. Беларусы. Т.5. Сям'я / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш.; Рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 375с.: іл.
5. Вяселле: Абрад/ Уклад., уступ. артыкул і камент. К.А. Цвіркі; муз. дадатак З.Я. Мажэйка; рэд. тома В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978.
6. Гілевіч, Н. Песні пра бясцэнны дар жыцця / Н. Гілевіч // Купалінка. – Мінск: Беларусь, 1986. – с. 6–7.
7. Культура и христианство. Сайт профессора Московской духовной семинарии Осипова А.И. [Электронный ресурс] А.И. Осипов Аудиолекции. – Москва, 2012. – Режим доступа: http://www.aosipov.ru/audio. – Дата доступа: 20.12.2012.
8. Лобач, У.А. Секс і эротыка ў беларускай традыцыйнай культуры / У.А. Лобач // Пачатак. – 2004. - № 3.
9. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць [і інш.]; пад агульнай рэд. А.А. Грымаць. – Мінск: Выд. У.М.Скакун, 1999. – 256 с.

10. Сайт газеты “Салідарнасць” [Электронный ресурс] А. Зелянкова Голая праўда пра беларусаў. – Режим доступа: http://www.gazetaby.com. – Дата доступа: 19.12.2012.